14. TNA: PRO. – Dept.: CAB. – Series: 128. – Piece number: 27. – pp. 484 – 485. – 65th Conclusions of a meeting of the Cabinet held at 10 Downing Street, S.W.1, on Thursday, 14th October, 1954.
15. TNA: PRO. – Dept.: CAB. – Series: 129. – Piece number: 78. – pp. 64 – 74. – Colonial immigrants (Memorandum by the Secretary of state for the Home Department and Minister for Welsh Affairs).
16. TNA: PRO. – Dept.: CAB. – Series: 129. – Piece number: 93. – pp. 218 – 229 – Colonial immigrants (Memorandum by the Secretary of state for the Home Department and Minister for Welsh Affairs).
17. TNA: PRO. – Dept.: CAB. – Series: 129. – Piece number: – pp. 40 – 41. – Coloured immigration from the Commonwealth (Memorandum by the Secretary of state for the Home Department).
18. TNA: PRO. – Dept.: CAB. – Series: 129. – Piece number: 105. – pp. 56– 58. – Commonwealth migrants (Memorandum by the Lord Chancellor).
19. Commonwealth Immigrants Act 1962 – London: Stationery office, 1968 – 25 p.
20. TNA: PRO. – Dept.: LAB. – Series: 8. – Piece number: 1517. Memorandum of the Under Secretary of State for the Home Office.
21. TNA: PRO. – Dept.: LAB. – Series: 8. – Piece number: 1499. Letter from G. Wilson to R. Dymond (E.M. 530/47), 31 May 1948.



SUMMARY

*The article is devoted to the analysis of racial factor in the British immigration policy during 1948 – 1962. Unlike the traditional historiography which emphasizes racist nature of British immigration policy, the author considers racism as a crucial factor which limited Conservative and Labour governments from introduction of control on coloured immigration from the Commonwealth.*


Пастуліў у рэдакцыю 08.02.2012 г.

---

*УДК 94(510+569.4)«1950/1992»*

***В.У. Адзярыха,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*

## КІТАЙСКА-ІЗРАІЛЬСКІЯ АДНОСІНЫ Ў КАНТЭКСЦЕ БЛІЗКАЎСХОДНЯЙ ПАЛІТЫКІ КНР (1950–1992 гг.)

Усталяванне ў 1992 г. дыпламатычных адносін паміж Ізраілем і Кітайскай Народнай Рэспублікай (КНР) стала важнай вехай у гісторыі абедзвюх краін, што азначала факт узросшага ўплыву Кітая на міжнароднай арэне. Нягледзячы на тое, што Ізраіль быў першай блізкаўсходняй краінай, якая прызнала ў 1950 г. КНР, ад прызнання «дэ-факта» да прызнання «дэ-юрэ» прайшло больш за 40 вельмі няпростых гадоў, якія ўвабралі першыя спробы наладжвання араба-ізраільскага дыялогу, гады канфрантацыі, і, нарэшце, поўную нармалізацыю двухбаковых адносін. Мэта дадзенай працы ў тым, каб выявіць асноўныя этапы развіцця адносін Ізраіль – КНР у 1950 – 1992 гг.

Варта адзначыць адносна слабую вывучанасць дадзенай праблемы. Можна вылучыць працы ізраільскага сінолага І. Шыхора і брытанскай даследчыцы і дыпламата Л.К. Харыс. Абодва з'яўляюцца аўтарамі фундаментальных манаграфій па гісторыі адносін Кітая і Блізкага Усходу, значная ўвага ў якіх нададзена кітайска-ізраільскім кантактам 1950–1992 гг. Неабходна згадаць амерыканскіх навукоўцаў Дж. Голдстэйна і У.У. Хадада, ізраільскага навукоўца А. Шая, індыйскага навукоўца П.Р. Кумарасвамі, якія займаліся асобнымі аспектамі кітайска-ізраільскіх адносін.

У першыя гады існавання КНР галоўнай задачай яе кіраўніцтва ў галіне знешняй палітыкі была праблема легітымізацыі новага Кітая на міжнароднай арэне. Акрамя краін савецкага блока, КНР была прызнана толькі некалькімі несацыялістычнымі краінамі. Кіруючыя на Блізкім Усходзе рэжымы праводзілі антыкамуністычны курс, працягваючы прызнаваць урад Кітайскай Рэспублікі, што знаходзіўся з 1949 г. на в. Тайвань.

9 студзеня 1950 г. міністр замежных спраў Ізраіля Машэ Шарэт накіраваў міністру замежных спраў КНР Чжоў Эньлаю тэлеграму аб афіцыйным прызнанні КНР [6, р. 21]. Тэлеграмай ад 16 студзеня 1950 г. міністр замежных спраў КНР Чжоў Эньлай перадаў «сяброўскае прывітанне і пажаданні росквіту Ізраілю» [3, р. 83].

Але нягледзячы на ўзаемнае прызнанне, паўнавартасныя дыпламатычныя адносіны паміж дзвюма краінамі не былі ўстаноўлены. У канцы студзеня 1950 г. ізраільскае МЗС праінфармавала свае пасольства ў Маскве, што ў урада, па прычыне фінансавых цяжкасцей, няма намеру адкрываць прадстаўніцтва ў Пекіне і што мяркуецца выкарыстаць ізраільскае пасольства ў Савецкім Саюзе для ажыццяўлення дыпламатычных кантактаў з КНР [6, р. 23].

Што датычыцца кітайскага боку, то ім былі распачаты некалькі спроб прамых кантактаў з ізраільскімі дыпламатамі, галоўным чынам, праз пасольства Ізраіля ў СССР. У чэрвені 1950 г. пасол КНР у СССР правёў перамовы са сваім ізраільскім калегам у Маскве. Сярод іншых, кітайскі прадстаўнік паднімаў пытанне аб усталяванні паўнавартасных адносін паміж КНР і Ізраілем [3, р. 83–84]. Гэты факт сведчыў аб сур'ёзнасці намераў кіраўніцтва КНР усталяваць дыпламатычныя адносіны з Ізраілем.

На ізраільска-кітайскі дыялог аказала негатыўны ўплыў распачатая ў чэрвені 1950 г. вай-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на ў Карэі, бо Ізраіль заняў у дадзеным пытанні праамерыканскую пазіцыю. 1 лютага 1951 г. ізраільскі прадстаўнік галасаваў у ААН за рэзалюцыю, якая асуджае КНР, а 18 мая 1951 г. за рэзалюцыю, якая ўводзіла супраць яе эканамічныя санкцыі за ўдзел кітайскіх войскаў у карэйскім канфлікце. Зрэшты, кіраўніцтва Кітая паставілася да гэтага дастаткова прагматычна. Уяўлялася значна больш важным, што Ізраіль, асуджаючы дзеянні КНР у Карэі, пры гэтым нязменна галасаваў на Генасамблеях ААН за перадачу месца, якое займалася прадстаўніком Тайваня КНР: 19 верасня 1950 г., 6 лістапада 1951 г. і 25 кастрычніка 1952 г. [6, р. 24].

У канцы 1953 г. кітайскае знешнепалітычнае ведамства распачало крокі па актывізацыі дыялогу з Ізраілем. Сустрэчы паміж кітайскімі і ізраільскімі дыпламатамі, у асноўным па кітайскай ініцыятыве, адбыліся ў Маскве, Хельсінкі і Лондане. Найбольш плённы дыялог адбыўся ў Рангуне (зараз – Янгон) Бірма (зараз – М'янма) паміж кітайскім паслом у Бірме Яо Чжунмінам і ізраільскім паслом Давыдам Хакаэнам. Падчас сустрэч, кітайскі пасол афіцыйна паінфармаваў ізраільскага дыпламата аб тым, што ўрад Кітая прывітае адкрыццё ізраільскай місіі ў Бірме, і пацікавіўся, ці разглядае Ізраіль магчымасць «больш цесных сувязей з Пекінам» [3, р. 84]. У студзені 1954 г. кітайскі бок праінфармаваў Хакаэна аб тым, што ён спадзяецца на ўсталяванне гандлёвых адносін з Ізраілем і жадаў бы ведаць пра тавары, у якіх ізраільскі бок зацікаўлены.

У чэрвені 1954 г. Хакаэн меў сустрэчу з Чжоу Эньлаем, які знаходзіўся ў Рангуне па шляху дадому са свайго першага візіту па краінах Афрыкі [4, р. 23]. Кітайскі прэм'ер запэўніў ізраільскага пасла ў зацікаўленасці КНР у гандлі з Ізраілем і выказаў надзею, што хутка ўбачыць свайго суразмоўцу ў Пекіне.

14 верасня 1954 г. ізраільскі ўрад атрымаў афіцыйнае запрашэнне ад МЗСа КНР дасланы дэлегацыю для абмеркавання пытанняў узаемнага гандлю, а таксама іншых пытанняў, якія «датычацца дзвюх дружалюбных краін» [3, р. 26].

Усё гэта адбывалася ва ўмовах, неспрыяльных для развіцця кітайска-ізраільскіх адносін. У той час як ізраільскае кіраўніцтва схілялася да пашырэння сувязей, кітайскае, наадварот, праяўляла ўсё большыя ваганні. Гэта было звязана з тым, што да 1955 г. для КНР намячалася перспектыва нармалізацыі адносін з арабскімі краінамі, што было значна больш важна ў плане прарыву знешнепалітычнай ізаляцыі.

У лістападзе, калі ізраільскі ўрад прыняў канчатковае рашэнне аб адпраўцы дэлегацыі, яе члены былі праінструктаваны весці перамовы толькі аб пытаннях, непасрэдна звязаных з арганізацыяй гандлю, не падымаючы пытання ўсталявання дыпламатычных адносін. У выпадку, калі кітайскі бок падняў бы гэта пытанне, меркавалася адказаць сцвярджальна, але ў нявызначаных выразах [6, р. 26].

З 28 студзеня па 21 лютага ізраільская гандлёвая дэлегацыя на чале з пасолам Хакаэнам знаходзілася ў КНР. У яе склад уваходзілі прадстаўнікі ізраільскага бізнесу, уключаючы дырэктара дэпартамента Азіі ізраільскага МЗСа. Знешне візіт праходзіў у добразычлівай атмасферы, кітайскія прадстаўнікі на перамовах падкрэслівалі, што «Кітайскі народ і яго ўрад – добрыя сябры Ізраіля і яўрэйскага народа» [3, с. 85]. Намміністра гандлю КНР выявіў цікавасць да куплі ў Ізраілі самага шырокага спектра тавараў: хімікатаў, угнаенняў, запчастак, грузавікоў, прамысловых дыяментаў, покрывак, стаматалагічнага абсталявання, прычым у «вялікіх колькасцях» [3, с. 85]. Абмяркоўвалася пытанне ўсталявання дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі, прычым кітайскі бок выявіў відавочную зацікаўленасць у дадзеным пытанні. Так, ён нават прапанаваў выдзеліць бясплатна памяшканне ў Пекіне для ізраільскага прадстаўніцтва ў якасці кампенсавання за ізраільскую ўласнасць, нацыяналізаваную ў Шанхаі [6, с. 26]. Па выніках візіту быў падпісаны сумесны ізраільска-кітайскі пратакол з 5 пунктаў, у якім гаварылася аб жаданні дзвюх краін усталяваць гандлёвыя адносіны.

Нягледзячы на знешне дружалюбны прыём, адчувалася некаторая скаванасць з кітайскага боку. Ізраільскіх прадстаўнікоў сустракалі службоўцы ў рангу намеснікаў, іх не прыняў ніхто з вышэйшых кіраўнікоў КНР. У афіцыйных кітайскіх СМІ пра візіт практычна не згадвалася. На тое былі сур'ёзныя прычыны.

Ваганні кітайскіх кіраўнікоў былі звязаны з канферэнцыяй Афра-Азіяцкіх дзяржаў у Бандунгу (Інданезія). У снежні 1954 г. у Багоры (Інданезія) адбылася другая сустрэча Дзяржаў Каломба, прысвечаная арганізацыйным пытанням саміту, які планаваўся правесці. Вострыя дыскусіі выклікала пытанне спісу запрошаных на канферэнцыю краін. 20 снежня Генеральны сакратар Лігі Арабскіх Дзяржаў (ЛАГ) прадставіў арганізатарам канферэнцыі занатоўку, у якой, сярод іншага, гаварылася: «Палітыка арабскіх дзяржаў заключаецца ў тым, каб не прымаць удзел у якой-небудзь рэгіянальнай канферэнцыі, дзе прадстаўлены Ізраіль. У арабскіх дзяржаў няма ніякіх сумненняў, што Ізраіль не будзе запрошаны на гэту канферэнцыю і не будзе ўдзельнічаць» [6, р. 51].

На Бандунгскай канферэнцыі, якая адбылася 18–24 красавіка 1955 г., з 24 прадстаўленых на ёй краін, 18 да моманту правядзення канферэнцыі не мелі дыпламатычных адносін з КНР. Магчымасць нармалізацыі адносін адразу з вялікай колькасцю дзяржаў значыла для Кітая значна больш у справе выхаду са стану міжнароднай ізаляцыі, чым адносіны з Ізраілем.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Кіраўніцтва КНР зрабіла канчатковы выбар на карысць наладжвання адносін з арабскімі дзяржавамі.

Падчас канферэнцыі прэм'ер Дзяржрады КНР Чжоў Эньлай сустракаўся з кіраўніком Егіпта Г.А. Насерам і намеснікам генеральнага сакратара ЛАГ Ахмедам Шукейры (з 1964 г. – старшыня Арганізацыі вызвалення Палесціны). Разам з тым, пераход кітайскага боку на анты-ізраільскія пазіцыі першапачаткова насіў дастаткова асцярожны характар. Кітайскія СМІ спачатку пазбягалі прамых абвінавачванняў у адрас Ізраіля, крытыкуючы перш за ўсё палітыку заходніх дзяржаў на Блізкім Усходзе.

Не змаглі пераламаць сітуацыю і прыпозненыя спробы Ізраіля пачаць перамовы аб усталяванні кітайска-ізраільскіх дыпламатычных адносін. 3 красавіка 1955 г. міністр замежных спраў Ізраіля накіраваў у МЗС КНР афіцыйнае запрашэнне для кітайскай гандлёвай дэлегацыі. Хоць у ноце ізраільскага МЗС і не згадвалася аб усталяванні афіцыйных адносін паміж дзвюма краінамі, пасол Хакаэн быў праінструктаваны давесці да кітайскага пасла ў Бірме жаданне Ізраіля ўсталяваць з КНР дыпламатычныя адносіны. 29 красавіка 1955 г. быў зроблены фармальны зварот ізраільскага міністра замежных спраў Д. Левіна да Чжоў Эньлая аб тым, што Ізраільскі ўрад «жадае ўсталяваць поўныя дыпламатычныя адносіны з урадам КНР у як мага бліжэйшы зручны момант» [3, p. 85]. Аднак толькі 21 мая 1955 г. кіраўнік Азіяцкага аддзела МЗС КНР ветліва, але вельмі невыразна, паведаміў ізраільскаму боку, што аб яго прапанове будзе дакладзена ўраду КНР.

У ліпені 1955 г. у Кітай прыбыў з прыватным візітам пасол Ізраіля ў СССР, ён быў прыняты рэктарам Кітайскага народнага ўніверсітэта міжнародных адносін і намеснікам міністра замежных спраў КНР. Абодва гаварылі з ізраільскім прадстаўніком у вельмі добразычлівым духу, паказаўшы добрую інфармаванасць у ізраільскіх справах. Але калі было паднята пытанне дыпламатычных адносін, абодва кітайскіх суразмоўцы адказалі, што час яшчэ не падышоў для такіх адносін, дадаўшы, што супрацоўніцтва павінна быць працягнута ў розных галінах, і вельмі хутка, магчыма, прыйдзе час для ўсталявання дыпламатычных адносін [6, p. 56].

Між тым, у ліпені 1956 г. упершыню ў кітайскім друку з'явіліся публікацыі, якія крытыкавалі сіянізм. Незадоўга да гэтага былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны паміж КНР і Егіптам (16 мая 1956 г.), а неўзабаве яшчэ з некалькімі арабскімі краінамі.

У перыяд Суэцкага крызісу ўвосень 1956 г. КНР заняло адназначна праарабскую пазіцыю. Упершыню ў афіцыйных заявах кітайскіх кіраўнікоў Ізраіль быў названы «інструментам імперыялістычнай агрэсіі» [6, p. 58]. Тым не менш, у красавіку-маі 1957 г. па запрашэнні Усекітайскай студэнцкай федэрацыі КНР наведала група ізраільскіх студэнтаў.

У лістападзе 1957 г. даволі кур'ёзны эпізод адбыўся на Нарадзе лідараў камуністычных партый у Маскве. Генеральны сакратар ізраільскай кампартыі Шмуэль Мікуніс падчас сустрэч з Мао Цзэдунам папрасіў апошняга хадайнічаць перад М.С. Хрушчовым аб адраджэнні яўрэйскай культуры ў СССР [5, p. 90].

Далейшае пагаршэнне кітайска-ізраільскіх стасункаў (аж да поўнага замарожвання якіх-небудзь прамых кантактаў) адносіцца да канца 1950 – пачатку 1960-х гг. У гэты час кіраўніцтва КНР у знешняй палітыцы ўзяло курс на падтрымку рэвалюцыйных рухаў у краінах «Трэцяга свету». У прыватнасці, гэта выявілася ў падтрымцы барацьбы палесцінцаў супраць Ізраіля. У студзені 1965 г. КНР афіцыйна прызнала Арганізацыю вызвалення Палесціны (АВП), у Пекіне было адкрыта яе прадстаўніцтва. Калі ў сакавіку 1965 г. старшыня АВП Ахмед Шукейры прыбыў з візітам у КНР, то яго прымалі па разрадзе кіраўнікоў дзяржаў: ён быў прыняты ўсімі вышэйшымі кіраўнікамі КНР (Мао Цзэдунам, Чжоў Эньлаем, Лю Шаоцы) [2, p. 44]. Мао Цзэдун запэўніў Шукейры, што КНР «ніколі не зможа прызнаць Ізраіль, таму што ён – база для амерыканскіх, брытанскіх, французскіх і заходнегерманскіх імперыялістаў» [3, p. 118].

Да гэтага часу кіраўніцтва КНР заняло адкрыта варожую ў адносінах да Ізраіля пазіцыю, што адлюстроўвалася не толькі ў вуснай, але і практычнай формах – пастаўкамі зброі, падтрымцы АВП. У 1965 – 1969 гг. АВП атрымала ад Кітая зброі на 5 млн дол. [3, p. 119]. Пры гэтым урады арабскіх краін крытыкаваліся як у кітайскай прэсе, так і на афіцыйным узроўні за недастаткова рашучую пазіцыю ў адносінах да Ізраіля.

Ізраіль у гэтыя гады развіваў супрацоўніцтва з уладамі на Тайвані, перш за ўсё ў ваеннай сферы. Праз Ізраіль на Тайвань быў перададзены шэраг амерыканскіх узбраенняў і ваенных тэхналогій, якія ЗША не рашаліся пастаўляць туды напрамую. Так, у 1970-х гг. Тайваню былі перададзены тэхналогіі па вытворчасці амерыканскіх тактычных ракет [1, p. 19].

Аднаўленне ў 1971 г. членства КНР у ААН, і далейшая нармалізацыя адносін з вядучымі заходнімі дзяржавамі, спрыялі змякчэнню пазіцыі Кітая па блізкаўсходнім пытанні. Пры захаванні антыізраільскай рыторыкі, з 1973 г. падтрымка КНР АВП стала насіць хутчэй славесны, чым ваенны характар [2, p. 47].

Пасля смерці ў верасні 1976 г. Мао Цзэдуна і прыходу да кіраўніцтва КНР прагматыкаў на чале з Дэн Сяапінам, вызначылася перспектыва паступовай нармалізацыі ізраільска-кітайскіх адносін.

У прыватных гутарках з заходнімі дыпламатамі кітайскія афіцыйныя асобы станоўча адклі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каліся аб егіпецка-ізраільскім мірным дыялогу, хоць і ўстрымаліся ад іх падтрымкі на афіцыйным узроўні. У 1979 г. кіраўніцтва КНР адмовілася асудзіць Кэмп-Дэвідскія дамовы, параіўшы АВП «прыняць практычныя крокі і злучаць прынцыповую пазіцыю з гнуткай стратэгіяй» [3, p. 168].

Хоць у другой палове 1970-х гг. у кітайскай прэсе яшчэ гаварылася аб Ізраілі як «штучным утварэнні» імперыялізму і «кінжале ў сэрца арабскаму свету», неафіцыйныя кантакты паміж дзвюма дзяржавамі пачынаюць наладжвацца.

Важна адзначыць, што кітайска-ізраільскія кантакты мелі месца нават у 1960-я гг., у першую чаргу, праз Сянган. Так, у 1974 г. 6,5 % ізраільскага экспарту прыходзілася на Сянган [3, p. 170]. Няма сумнення, што значная яго частка трапляла ў КНР.

У сакавіку 1978 г. афіцыйнае выданне КПК газета «Жэньмінь жыбао» заявіла аб магчымасці прызнання Кітаем Ізраіля, калі той адмовіцца ад палітыкі агрэсіі і экспансіянізму. У чэрвені 1978 г. міністр замежных спраў КНР Хуан Хуа таемна сустракаўся з ізраільскім міністрам абароны Эзерам Вейцманам у Швейцарыі.

Важнае значэнне ў пошуку кропак судотыку абедзвюх краін мелі кантакты ў ваеннай сферы. На Парыжскім авіясалоне ў чэрвені 1975 г. кітайскія прадстаўнікі ўпершыню выявілі адкрытую цікавасць да ізраільскага знішчальніка «Кфір». У 1978 г. на выставе ўзбраенняў у Швейцарыі, кітайскія і ізраільскія прадстаўнікі абмяркоўвалі супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, пасля чаго міжнародны гандляр зброяй Шауль Эйзенберг арганізаваў у сакавіку 1979 г. таемны візіт у КНР групы ізраільскіх афіцыйных асоб з мэтай ініцыіраваць «эканамічныя і культурныя сувязі». Праз месяц гэта гісторыя ўсплыла на старонках газеты «Гаарэц».

З гэтага часу Ізраіль згортвае ваеннае супрацоўніцтва з Тайванем, у прыватнасці, у 1978 г. адмовіўся ад продажу Тайваню знішчальнікаў «Кфір».

У красавіку 1979 г. Хуан Хуа на сустрэчы з членамі камітэта па замежных справах Сената ЗША заявіў, што Кітай з разуменнем ставіцца да патрэбы Ізраіля ў бяспецы і не жадае, каб яўрэйская дзяржава «была скінута ў мора» [3, p. 172].

У студзені 1981 г. адказны супрацоўнік Сакратарыята ААН ад КНР наведаў Ізраіль, фармальна ў складзе місіі ААН з інспекцыяй міратворцаў ААН, неафіцыйна меў сустрэчы з першымі асобамі Ізраіля.

У пачатку 1985 г. кітайская дэлегацыя ў галіне сельскай гаспадаркі наведала Ізраіль, як вынік, у чэрвені 1985 г. група ізраільскіх бізнесменаў наведала КНР, падпісаўшы шэраг кантрактаў. У тым жа годзе ў Сянгане было адкрыта консульства Ізраіля [4, p. 27].

У красавіку 1986 г. мела месца таемная сустрэча прэм'ер-міністра Ізраіля Абрахама Таміра з кітайскімі прадстаўнікамі ў Парыжы. У сакавіку 1987 г. А. Тамір, ужо ў якасці генеральнага дырэктара МЗС Ізраіля, сустракаўся з кіраўніком кітайскай дэлегацыі ў ААН Лі Луе.

У снежні 1989 г. падчас візіту ў Егіпет старшыня КНР Ян Шанкунь афіцыйна прызнаў, што Кітай падтрымлівае неафіцыйныя навуковыя і культурныя сувязі з Ізраілем. У лютым 1990 г. было адкрыта бюро турыстычнага агенцтва КНР у Тэль-Авіве, а ў чэрвені таго ж года ў Пекіне бюро па сувязях Ізраільскай акадэміі навук, чый персанал уключаў адстаўных супрацоўнікаў МЗС Ізраіля. Неўзабаве бюро ўзначаліў Зееў Сіфот – адстаўны ізраільскі пасол.

У сакавіку 1991 г. Ізраіль наведаў кіраўнік Дэпартамента Заходняй Азіі МЗС КНР, былы пасол у Сірыі. Візіт у адказ нанёс Рэўвен Мерхаў, генеральнаы дырэктар МЗС Ізраіля, былы генеральны консул у Сянгане.

У лістападзе 1991 г. міністр абароны Ізраіля Машэ Арэнс наведаў Пекін, дзе сярод іншых пытанняў абмяркоўваў праблему продажу Кітаем зброі некаторым, на погляд ізраільскага кіраўніцтва, радыкальным арабскім рэжымам. У снежні 1991 г. намеснік міністра замежных спраў КНР Ян Фучан наведаў Ізраіль.

Афіцыйныя дыпламатычныя адносіны паміж Ізраілем і КНР былі ўсталяваны 24 студзеня 1992 г. падчас візіту ў КНР міністра замежных спраў Ізраіля Давыда Леві. Абедзве краіны дамовіліся развіваць адносіны на аснове «Пяці прынцыпаў мірнага суіснавання». Ізраіль прызнаў урад КНР як «адзіны законны ўрад, які прадстаўляе ўвесь Кітай», а Тайвань – яго неад'емнай часткай.

*Літаратура і крыніцы*

1. *Goldstein, J.* The Republic of China and Israel / J. Goldstein // China and Israel, 1949–1998: a fifty year retrospective / ed. by Jonathan Goldstein. – Westpoint, Conn.: Praeger, 1999. – P. 1 – 35.
2. *Haddad, W.W.* Foeldy-Hardy M. Chinese – Palestinian relations / W.W. Haddad // China and the Middle East: the quest for influence / ed. by Kumaraswamy. – New Delhi; Thousand Oaks (Calif): Sage Publications, 1999. – P. 42 – 51.
3. *Harris, L.C.* China considers the Middle East / L.C. Harris. – London: I.B. Tauris, 1993.
4. *Kumaraswamy, P.R.* China and Israel: Normalisation and after / P.R. Kumaraswamy // China and the Middle East: the quest for influence / ed. by Kumaraswamy.– New Delhi; Thousand Oaks (Calif): Sage Publications, 1999. – P. 20–40.
5. *Shai, A.* The Israeli Communist Party's Policy toward the People's Republic of China, 1949–1998 / A. Shai // China and Israel, 1949–1998: a fifty year retrospective / ed. by Jonathan Goldstein. – Westpoint, Conn.: Praeger, 1999. – P. 83–94.
6. *Shichor, Y.* The Middle East in China's foreign policy, 1949–1977 / Y. Shichor. – Cambridge; New York: Cambridge University Press, 1979.

*Summary*

*The establishment of diplomatic relations between China and Israel in January 1992 was an important development for both countries. Israel, the first Middle Eastern country to recognize in 1950 People Republic of China, had to wait for over four decades to secure Chinese political and diplomatic recognition. The pro-*

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

*cess of normalization was largerly influenced by the Arab-Israeli conflict.*

*During the four decades of 'non-relations' between Israel and China (1950–1992), three events – the Korean War, the Bandung Conference of 1955 and the emergence of Deng Xiaoping – are important milestones. First, the sluggishness on the part of Israel to translate its recognition into diplomatic relation received its first setback in June 1950 when the Korean war erupted. At Bandung Conference of 1955 PRC leaders made the choice in favor of the Arab and Islamic countries. During the next two decades, Israel unsuccessfully sought to modify China's position.*

Паступіў у рэдакцыю 26.12.2011 г.

---

*УДК 94(430)«1918/1933»*

***А.Г. Субоцін,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*

# ПАЛІТЫЧНЫ КАТАЛІЦЫЗМ У БАВАРЫІ (1918–1933 гг.)

Адным з найярчэйшых носьбітаў ідэалогіі палітычнага каталіцызму ў гады Веймарскай рэспублікі выступала Баварская народная партыя (далей – БНП). Заснаваная ў лістападзе 1918 г., у сваёй дзейнасці яна кіравалася філасофіяй артадаксальнага федэралізму, заклікаdebнага наравне з абаронай канстытуцыйных правоў зямель весці барацьбу з рэспубліканскім рэжымам і прускім уплывам у нямецкай дзяржаве. Гэта мела негатыўныя наступствы для ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Германіі, заахвочвала правы экстрэмізм, перашкаджала мадэрнізацыі дзеючых інстытутаў улады і, у канчатковым выніку, кансалідацыі нямецкага грамадства перад узрастаючай пагрозай фашызму. На жаль, у айчыннай гістарыяграфіі вышэйназванай тэме не надавалася належнай увагі. Часткова дзейнасць БНП асветлена ў манаграфіі А.Г. Субоціна «Веймарскі федэралізм» [1]. Між тым, праблема палітычнага каталіцызму і цяпер застаецца запатрабаванай у гістарычнай навуцы ФРГ, улічваючы акадэмічную дыскусію апошніх дзесяцігоддзяў, прысвечаную прычынам няўдач першага вопыту нямецкай дэмакратыі. Асобна варта назваць працы В.Г. Цымермана, Ф. Менгеса, Д. Лаў, М.П. Геймерса, К. Ротэнбюхера, Г. Шульца і інш., якія дэманструюць шырокі дыяпазон поглядаў на ключавыя падзеі гісторыі 1918 – 1933 гг. [14–15; 17; 21; 27; 34]. Усё вышэйсказанае паслужыла асноватворным матывам для дадзенага даследавання, аўтар якога, спрабуючы разабрацца ў сутнасці палітычнага каталіцызму ў Баварыі і ступені яго ўплыву на грамадскія працэсы, звяртаецца да аналізу шырокага спектра крыніц.

Баварскі палітычны каталіцызм дэманстраваў асаблівы тып мышлення, заснаваны на 1000-гадовай гісторычнай прасторы народа і дзяржавы, асаблівасцях нацыянальнага характару і «місіянерскіх прэтэнзіях» рэгіянальнай эліты на ролю гаранта «саюзных адносін» у краіне [18, S. 70–71; 14, S. 379]. Да 1914 г. зямля захоўвала высокую ступень дзяржаўнай аўтаноміі, якая ў яе прававым сегменце значна пераўзыходзіла ўзровень іншых суб'ектаў імперыі. Гэта, аднак, не выключала непаразуменняў на глебе мясцовага партыкулярызму і ўтоенага непрымання прускай гегемоніі. Пачатыя ў Баварыі задоўга да лістападаўскіх падзей 1918 г. ліберальна-дэмакратычныя рэформы, сацыяльная структура грамадства, якое абапіралася на пануючы ў рэгіёне аграрны сектар эканомікі і моцную праслойку сярэдняга класа, і, нарэшце, збалансаваная палітыка дынастыі Вітэльсбахаў забяспечвалі адносна высокую стабільнасць паўднёва-германскаму карадзеўству. У гэтым плане рэвалюцыя прынцыпова не паўплывала на кансерватызм грамадскай думкі [34, S. 71, 74]. «Федэратыўна-хрысціянска-каталіцкая Баварыя супраць цэнтралісцкіх, атэістычных марксісцкіх Берліна і Прусіі; чорна-бела-чырвоная нацыяналістычная Баварыя супраць чорна-чырвона-залатога і крывава-інтэрнацыянальна-марксісцкага Берліна» і «Баварыя баварцам!», – такія былі палітычныя лозунгі баварскіх каталікоў напярэдадні выбараў у Нацыянальны сход [6, S. 71; 20, S. 303].

Спецыфіку імперска-зямельных адносін у гады Веймарскай рэспублікі вызначалі мясцовыя федэралісты, увасабленнем якіх на працягу 1920–1933 гг. выступала БНП. Пачынаючы з сакавіка 1920 г., партыя дамінавала на ўнутрыпалітынай арэне, вынікам чаго з'явілася фарміраванне «антывеймарскага фронту» пад лозунгам «федэратыўнай рэвізіі канстытуцыі» [5]. Аб гэтым красамоўна сведчыла Бамбергская праграма БНП ад 18 верасня 1920 г., у ліку прыярытэтных патрабаванняў якой значыліся: ураўнаванне рэйхсрата ў правах з рэйхстагам, свабода ў выбары формы кіравання і канстытуцыі, вяртанне землям фінансавай, чыгуначнай, транспартнай і паштовай аўтаноміі, усталяванне тэрытарыяльнага прынцыпу арганізацыі рэйхсвера, перадача пытанняў школы ў выключнае веданне «саюзных дзяржаў» і г. д. [22, S. 63]. Выданне «Форвертс», якое належала СДПГЮ, параўнала федэралізм «баварскага ўзору» з анахранізмам, які цягнуў краіну ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ